View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Zhytomyr State University Library

УДК 801.3.26 (09)

Т.М. Казачэнка

# ЛЕКСІКА САЦЫЯЛЬНАЙ НАКІРАВАНАСЦІ Ў БЕЛАРУСКІХ ГРАМАТАХ РАННЯГА ПЕРЫЯДУ

*У статті аналізується лексика білоруської мови у період формування білоруської народності – за ткстами кацелярсько-юридичних документів (час XIV – поч.XVI ст.), тісно пов'язаними з мовною практикою того часу. Показано, що в основі своїй ця лексика – питома білоруська, позначена етимологічною однорідністю*

Беларуская пісьменнасць XIV – пачатку XVI ст. была абмежавана ў асноўным граматамі, якія паводле зместу і службовага прызначэння падзяляліся на дагаворныя, дарчыя, духоўныя, ахоўныя, купчыя, укладныя, устаўныя і інш. Вызначаючыся шырокім ахопам рэчаіснасці, цесна звязаны з жывой моўнай практыкай таго часу, гэты жанр канцылярска-юрыдычнай дакументацыі з'яўляецца каштоўнай крыніцай для вывучэння лексічных сродкаў, што ў перыяд фарміравання беларускай народнасці былі ў актыўным ужытку не толькі прывілеяваных, але і ніжэйшых слаёў насельніцтва Вялікага княства Літоўскага.

Сярод вядомых нам юрыдычных дакументаў ранняга перыяду найбольш змястоўным выглядае збор полацкіх грамат [1]. Асабліва багатым намінацыйным матэрыялам прадстаўлены тут прадметна-тэматычныя групы слоў, якія характарызуюць тагачасныя сацыяльныя адносіны.

У тэматычнай групе слоў, што аб'ядноўвае лексіку грамадска-палітычнай сферы, прыкметную падгрупу складаюць назвы службовых асоб вышэйшага рангу. Найбольшай ужывальнасцю сярод іх вылучаецца слова господарь /осподарь/ 'вялікі князь /найвышэйшы княжацкі тытул у Вялікім княстве Літоўскім/'. У сінанімічныя адносіны з гэтай намінацыяй уступае словазлучэнне великий князь, а часам і лексема король, паколькі некаторыя польскія манархі займалі вярхоўную кіруючую пасаду і ў Вялікім княстве Літоўскім. Сведчаннем сказанага можа служыць наступны прыклад: мне дей господар король и великий князь тых людей ис тою землею дал [1, т. III, с.5].

Што датычыць слова князь без эпітэта великий, то яно ўжываецца для абазначэння ўладальніка ўдзельнага княства ў складзе дзяржавы: держить братъ нашъ князь Скирикгаило оу Литовьской земли княженье Троцкое [1, т.1, с.51].

Для намінацыі іншых службовых асоб вышэйшага рангу ў полацкіх граматах выкарыстоўваюцца лексемы бурмистръ 'выбарны галава адміністрацыйнага органа гарадскога самакіравання – рады /магістрата/' воевода 'кіраўнік мясцовай адміністрацыі ў ваяводстве, военачальнік горада і гарадской акругі', войтъ 'службовая асоба, якая ўзначальвала мясцовае кіраванне', гетманъ 'камандуючы войскамі ў краіне або ў адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінцы', городничый 'камендант замка /горада/; начальнік замкавага суда', канцлеръ 'кіраўнік канцыляры вялікага князя, хавальнік вялікай дзяржаўнай пячаткі', конюший 'прыдворны, які адказваў за велікакняжацкія табуны і стайні', маршалокъ 'вышэйшая службовая асоба, якая наглядала за парадкам і этыкетам пры двары вялікага князя, старшынствавала на пасяджэннях рады', наместникъ /намесникъ/'службовая асоба мясцовага кіравання', подскарбий 'прыдворны, які загадваў дзяржаўным скарбам', подчаший 'прыдворны, які загадваў спіртнымі напіткамі', староста 'службовая асоба, якая кіравала адміністрацыйнай акругай /паветам/', хоружый 'службовая асоба, якая кіравала арганізацыяй баярскага і шляхецкага апалчэння ў час вайны' .

Асобную падгрупу ўтвараюць назвы падначаленых службовых асоб па іх адміністрацыйных пасадах, выканаўчых функцыях. Аб высокай ступені развіцця гэтай часткі старабеларускага слоўніка сведчаць ужытыя ў даследаваных граматах найменні биричъ /борецъ/ 'зборшчык падаткаў', бобровничый 'службовая асоба, якая наглядала за гадоўляй баброў і паляваннем на іх', восковничый 'чыноўнік, які займаўся зборам таможных даходаў з вывазу за граніцу воску', врадникъ /врядникъ/ службовая асоба ва ўрадах Вялікага княства Літоўскага', высланникъ 'пасланец', гонецъ 'ганец', дворанинъ /дворянинъ/ шляхціц, які служыў пры двары вялікага князя або буйнога феадала', десятникъ 'службовая асоба, у веданні якой было дзесяць гаспадарчых адзінак', дьякъ 'памочнік пісара', коморникъ 'чыноўнік, які вырашаў дробныя межавыя спрэчкі', лентвойтъ 'памочнік войта ў гарадах, якія атрымалі магдэбургскае права', ловчый 'службовая асоба пры дварах вялікага князя, ваяводы, старасты, якая распараджалася паляваннем', мерничый 'службовая асоба, якая вымярала зямельныя надзелы, устанаўлівала межавыя знакі', охмистръ 'дварэцкі', писарь 'пісарь', подвойский 'памочнік урадніка, які ахоўваў маёнткі шляхціцаў-апалчэнцаў ў час вайны', подтивунъ 'памочнік цівуна', посолъ 'пасол', путникъ 'пасыльны па службовых справах', радца /рядца/ 'член гарадской рады /магістрата/', секретарь 'сакратар', старецъ 'выбарная асоба сялянскага самакіравання', тивунъ 'службовая асоба мясцовай або дваровай адміністрацыі, якая кіравала гаспадарчымі справамі'.

Пашыраны ў полацкіх граматах таксама асабовыя намінацыі, якія вызначаюць сацыяльнае становішча прадстаўнікоў грамадства, сведчаць аб іх месцапражыванні. Да ліку іх адносяцца такія словы, як бояринъ 'ваенна-службылы землеўладальнік', державца 'часовы ўладальнік і аканом дзяржаўнага маёнтка, адначасова начальнік мясцовага дзяржаўнага кіравання', закладень 'цяглец, які перайшоў на службу да феадала', земецъ 'мясцовы жахар, уладальнік невялікага зямельнага надзелу', земянинъ /земенинъ/ 'ваенна-службылы землеўладальнік, васал вялікага князя ці магната', мещанинъ /местичъ/ 'гараджанін', огородникъ 'селянін, які пасяляўся на невялікай дзялянцы зямлі і выконваў вызначаныя павіннасці', одноземецъ 'зямляк', панъ 'прадстаўнік прывілеяваных слаёў грамадства', подворникъ 'маламаёмасны чалавек, які пасяліўся ў двары феадала', подданый 'падданы', слуга 'слуга', тяглецъ /теглицъ/ 'феадальна-залежны селянін, які абкладаўся дзяржаўным цяглом; цяглец', холопъ 'прадстаўнік прыгнечанага сялянства, прыгонны селянін'.

Да разгледжанага разраду лексічных адзінак можна аднесці таксама лексемы са зборнай семантыкай накшталт поспольство ’насельніцтва горада’, холопья ’прыгоннае сялянства’, челядь ’катэгорыя залежных ад феадалаў людзей, якія звычайна не мелі зямельных надзелаў і жылі ў дварах феадалаў’, чернь ’асноўная маса насельніцтва гарадоў – дробныя гандляры, рамеснікі, іншыя групы працоўнага насельніцтва’.

Канкрэтнае ўяўленне аб арганізацыі дзяржаўнага кіравання ў Вялікім княстве Літоўскім, выканаўчай дзейнасці чыноўніцкага апарату, тагачасным адміністрацыйным падзеле, унутрыдзяржаўных і міжнародных адносінах даюць словы воеводство ’ваяводства; праўленне ваяводы’, война ’вайна’, войтовство ’пасада войта’, волость ’воласць’, вольность ’прывілея’, городъ ’горад’, декретъ ’пастанова ўрада, якае мае сілу закона’, держава ’дзяржава’, дозволенье ’дазвол’, законъ ’закон, сукупнасць прадпісанняў’, замокъ ’замак’, княженье ’княжанне’, княжство /князство/ ’княства’, корона ’каралеўства’, место ’горад’, моистатъ ’каралеўская ўлада’, моцъ ’моц; правамоцнасць’, обычай ’звычай, традыцыя’, острогъ ’умацаваная частка горада’, панованье ’панаванне’, панство ’дзяржава’ паны рада ’вышэйшы орган дзяржаўнай улады у Вялікім княстве Літоўскім’, поветъ ’павет’, послушенство ’паслухмянасць’, посольство ’пасольства’, постановенье ’пастанова’, ратуша ’ратуша’, росказанье ’загад’, сведомье ’веданне; інфармаванасць’, служба ’служба; галіна заняткаў’, соймъ /суемъ, съемъ/ ’сейм’, тивунство ’пасада цівуна’, тытулъ ’тытул’, украина ’ускраіна, правінцыя’, урядъ /врядъ/ ’урад’, устава ’закон, прадпісанне’, ухвала ’пастанова’, чоломбитье /чолобитье/ ’чалабіцце’.

Асобнай падгрупай выступаюць лексічныя адзінкі, якія характарызуюць з’явы і падзеі грамадскага жыцця, сведчаць аб узаемаадносінах паміж людзьмі, у прыватнасці такія словы, як безправье ’беззаконнасць, самавольства’,

безчестье ’знявага’, бой ’бойка; збіванне, нанясенне пабояў’, втискъ ’уціск’, згода ’згода’, злоба ’злосць’, избытокъ ’самавольства, дрэнны ўчынак’, кгвалтъ /квалтъ/ ’гвалт, насілле’, кривда ’крыўда’, любовь ’пачуццё глыбокай прыхільнасці’, милость ’літасць; ветлівы зварот да высокапастаўленай асобы’, миръ ’мір’, нагабанье ’прымус, уціск’, насильство /насилье/ ’насілле’, незгода /незгодность/ ’нязгода, разлад’, нелюбовь /нелюбье/ ’непрыязныя адносіны, непокой /невпокой/ ’неспакой’, несправедливость ’несправядлівасць’, обида ’крыўда’, побитье ’збіванне’, поздровенье ’прывітанне’, поклепство ’узвядзенне паклёпу’, покой /впокой, упокой/ ’спакой’, похвалка ’пагроза’, приязнь ’прыязнасць’, приятельство ’сяброўства’, розмирье ’парушэнне мірнага дагавору’, росторжка ’разлад, сварка’, соромота ’ганьба, сорам’, справедливость ’справядлівасць’, учинокъ /вчинокъ/ ’учынак’.

Наяўная ў ранніх беларускіх граматах юрыдычна-прававая лексіка ўключае як тэрміны спецыяльнага характару, так і словы, якія абазначаюць разнастайныя паняцці і рэаліі з галіны следча-выканаўчай дзейнасці. Сярод гэтых намінацыйных сродкаў вылучаюцца перш за ўсё назвы афіцыйных судовых асоб, судовых выканаўцаў, удзельнікаў судовага працэсу, злачынцаў накшталт децкий /децский/ ’судовы выканаўца’, ездокъ ’асоба, якая несла службу, звязаную з раз’ездамі па судовых справах’, збродень ’злачынец’, злодей ’злодзей’, зрядца ’здраднік’, истецъ ’ісцец’, подсудокъ ’памочнік суддзі’, светокъ ’сведка’, судья ’суддзя’, тать ’злодзей, грабежнік’, убийца ’забойца’.

Тагачасны ўзровень развіцця прававых норм раскрываюць таксама словы, звязаныя з абазначэннем агульных і прыватных паняццяў судаправядзення, мер і спосабаў пакарання, канкрэтныя назвы са сферы выканаўчай і следчай дзейнасці судовых органаў. У ліку іх найбольш ужывальнымі з’яўляюцца такія лексічныя адзінкі, як вырокъ ’прыгавор суда па крымінальнай ці рашэнне па грамадзянскай справе’, выступъ ’злачынства’, дело ’разбор судовай справы’, доводъ ’довад, доказ’, жалоба ’скарга’, избродня ’злачынства’, казнь ’турма’, каранье ’пакаранне’, нятство /няцтво/ ’зняволенне’, ортель ’пастанова гарадскога суда’, отпоръ ’адказ у судзе на абвінавачванне’, отправа ’выкананне судовага прыгавору’, порука /парука/ ’парука, паручыцельства’, право ’права’, присяга ’прысяга’, проступка ’злачынства’, присудъ ’судовая ўстанова; прысуд’, сведецтво /сведецство/ ’сведчанне’, сознанье ’прызнанне’, справа ’справа; судовае пасяджэнне’, судъ ’суд’, татьба ’крадзеж, грабеж’, турма ’турма’, тяжа ’цяжба’.

Некаторыя звесткі аб ступені распрацоўкі тагачаснай канцылярскай тэрміналогіі можна атрымаць на аснове назваў дакументацыі, частак дакументаў, копій і вытрымак з іх, у прыватнасці такіх, як выписъ ’ выпіска з дакумента’, грамота ’грамата’, листъ ’афіцыйны дакумент’, отписъ ’пісьмовае сведчанне, распіска’, привилей ’урадавы ўказ, прывілея’, списъ /списокъ/ ’спіс’, члонокъ ’параграф, пункт’.

Разгледжаная грамадска-палітычная і юрыдычная лексіка не вызначаецца этымалагічнай разнастайнасцю. У сваёй аснове яна спрадвечна беларуская. Нешматлікія ж запазычанні, якія сустракаюцца у полацкіх граматах XIV – пачатку XVI ст., абмяжоўваюцца пераважна паланізмамі вырокъ, державца, замокъ, збродень, земянинъ, зрядца, коморникъ, конюший, листъ, ловчый, место, моцъ, нагабанье, панъ, подвойский, подданый, подскарбий, подчаший, поспольство, похвалка, радца, сведомье, соймъ, устава, ухвала, хоружый, члонокъ, а таксама перададзенымі праз польскае пасрэдніцтва германізмамі бурмистръ, войтъ, гетманъ, канцлеръ, кгвалтъ, лентвойтъ, маршалокъ, ортель, охмистръ, рада, ратуша, турма, лацінізмамі декретъ, корона, моистатъ, привилей, секретарь, тытулъ, чэшскім па паходжанню словам мещанинъ.

У радзе адлюстраваных раннімі беларускімі граматамі намінацый сацыяльнай накіраванасці можна назваць таксама некалькі слоў іншамоўнага паходжання, якія не маюць непасрэдных адносін да характарыстыкі грамадскага ладу і адміністрацыйна-кіраўнічай структуры Вялікага княства Літоўскага, а з’яўляюцца тэрмінамі, звязанымі з грамадска-палітычным жыццём у іншых краінах. Так, непасрэднае дачыненне да грамадскага жыцця прыбалтыйскіх немцаў маюць экзатызмы кундоръ /кунтуръ, кунтырь/ ’чын у рыцарскім ордэне,’ местерь /мештерь/ ’магістр ордэна’, офмештерь ’ маршалак пры двары магістра’, ратманъ /ратманинъ/ ’член рыжскага магістрата’, ридель ’рыцар’.

У якасці абазначэння аднаго з прадстаўнікоў улады ў Маскоўскай дзяржаве выступае лексема окольничий ’гарадскі суддзя’.

У параўнанні з грамадска-палітычнай і юрыдычна-прававой лексіай назвы рэалій і паняццяў эканамічнай, фінансавай і камерцыйнай сферы займаюць у полацкіх граматах больш сціплае месца. Фактычна гэты асартымент намінацый абмяжоўваецца лексічнымі адзінкамі близкость ’права на маёмасць, якое выцякае з роднасці’, вечность ’бестэрміновае права валодання’, дедина ’спадчына ад дзеда’, дедичъ ’спадчыннік дзедавай маёмасці’, закладъ ’маёмасць, часова аддадзеная за пазыку’, зарука ’грашовае падмацаванне згоды’, именье ’маёнтак’, кормникъ ’гандляр харчовымі прадуктамі’, купля ’куплены ўчастак зямлі’, опека ’апека’, отчичъ ’спадчыннік бацькавай маймасці’, пожитокъ ’пажытак, карысць’, ринокъ ’рынак’, статокъ ’рэчы, маёмасць’, сума ’сума’, торговля ’гандаль’.

Да гэтай групы лексічных сродкаў прымыкаюць назвы падаткаў, гандлёвых пошлін і адміністрацыйна-судовых плацяжоў накшталт вина ’штраф за няяўку ў суд і іншыя прававыя парушэнні’, головщына ’плата за забойства, за нанясенне ран’, дань ’падатак, пабор рознага віду’, навязка ’грашовая кампенсацыя’, пересудъ ’плата за разгляд судовай справы’, прометъ ’штраф’, стацея ’сродкі на ўтрыманне праезджых службовых асоб’, цыншъ ’арэндная плата чынш’, явка ’плата замест з’яўлення па выкліку’.

З пералічаных сацыяльна-эканамічных лексем толькі нямецкія па паходжанню ринокъ і цыншъ і лацінскія стацея і сума былі запазычаны праз пасрэдніцтва польскай мовы.

Такім чынам, на падставе даследаванага лексічнага матэрыялу можна сцвярджаць, што ў галіне сацыяльнай лексікі беларуская мова ранняга перыяду свайго развіцця не адчувала яшчэ істотнага іншамоўнага ўздзеяння, узбагачаючы камунікатыўныя сродкі ў асноўным за кошт словаўтварэння на базе ўласнага каранясловa.

## ЛІТАРАТУРА

1. Полоцкие грамоты XIII – начала XVI вв., т. I –IV. М., 1977 – 1982

Козаченко Тетяна Михайлівна – кандидат філологічних наук, доцент Мозирського педагогічного інституту (Республіка Білорусь).

Наукові інтереси:

– Лексика білоруської мови польсько-литовської доби (історичний аспект).